*Матульскі Р. С.,*
*дэкан факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры, кандыдат педагагічных навук, дацэнт (г. Мінск)*

# ВЫШЭЙШАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ АДУКАЦЫЯ: ЗДАБЫТКІ І ПРАБЛЕМЫ

Сёння ў рэспубліцы Беларусь склалася сістэма бесперапыннай адукацыі ў галіне бібліятэчнай справы. Яе аснову складае падрыхтоўка спецыялістаў на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры (ФБІС БУК). Зараз на ФБІС БУК ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія" з прысваеннем кваліфікацыі "бібліятэкар-бібліёграф", бакалаўраў і магістраў гуманітарных навук, працуюць аспірантура і дактарантура.

Вышэйшая бібліятэчная адукацыя Беларусі за больш чым паўвекавы перыяд свайго існавання назапасіла пэўныя традыцыі і станоўчы вопыт па падрыхтоўцы кадраў для бібліятэк. Выпускнікі факультэта складаюць аснову працоўных калектываў бібліятэк розных тыпаў і відаў.

Новыя сацыяльна-эканамічныя і тэхналагічныя ўмовы патрабуюць пастаянных карэктыў арганізацыі і зместу падрыхтоўкі спецыялістаў для бібліятэчна-інфармацыйных устаноў. З мэтай падрыхтоўкі спецыялістаў, якія б адпавядалі сучасным патрабаванням, факультэты універсітэта ўносяць неабходныя змены ў вучэбны працэс.

На працягу 1990-х гадоў на ФБІС БУК ажыццяўлялася ўдакладненне пераліку спецыяльнасцей і спецыялізацый. Акрамя існуючых, быў адкрыты шэраг новых спецыялізацый: "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія, краязнаўства", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія старажытнай і рэдкай кнігі", "Кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю", "Менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы". Акрамя таго, уведзены такія здвоеныя спецыялізацыі, як "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія і замежная мова", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія і беларуская мова і літаратура".

З мэтай напаўнення рэальным зместам сістэмы бесперапыннай ФБІС БУК разам з Магілёўскім бібліятэчным тэхнікумам (МБТ) і Мінскім лінгва-гуманітарным вучэбным комплексам "гімназія-каледж" (МЛГВК) з 1995 г. пачаў рэалізоўваць праграму паскоранай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на базе сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У 1999 г. адбыўся ўжо другі выпуск спецыялістаў, якія прайшлі падрыхтоўку па спецыяльнай 3-гадовай праграме навучання ва універсітэце.

У 1998—1999 навучальным годзе факультэтам падрыхтаваны прапановы для МК і МА па ўдакладненню пераліку спецыяльнасцей і спецыялізацый. У межах спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія" прапануецца дадаткова ўвесці такія спецыялізацыі, як "дасугавая дзейнасць бібліятэк", "сацыяльная работа бібліятэк", "менеджмент інфармацыйных рэсурсаў", што накіраваны на паглыбленае вывучэнне студэнтамі сучасных бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій, форм і метадаў работы бібліятэк на рынку інфармацыі і дасуга, а таксама на бібліятэчнае абслугоўваннне асоб з абмежаванымі магчымасцямі.

Зыходзячы з усё больш узрастаючай ролі інфармацыі ў грамадстве, развіцця бібліятэчна-інфармацыйных устаноў новых тыпаў, факультэт прапанаваў увесці новую спецыяльнасць "Інфармацыйная дзейнасць". Студэнты па данай спецыяльнасці павінны быць арыентаваны на работу ў інфармацыйных цэнтрах і службах розных прадпрыемстваў і арганізацый, у аддзелах, якія ажыццяўляюць фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў як спецыяльных, так і публічных бібліятэк.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У мінулым навучальным годзе на факультэце таксама падрыхтаваны першы адукацыйны стандарт па падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія". Праект стандарта быў абмеркаваны на навукова-метадычнай канферэнцыі "Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты", якая праходзіла ў БУК 2—3 лютага 1999 г. і атрымала станоўчыя водгукі прадстаўнікоў буйнейшых бібліятэк рэспублікі.

Выкладчыкамі факультэта праводзіцца пастаянная актуалізацыя матэрыялаў вучэбных курсаў, рыхтуюцца да выдання падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, праграмы курсаў і другія вучэбна-метадычныя матэрыялы, накіраваныя на падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, адпавядаючых сучасным патрабаванням бібліятэк.

Разам з тым узрастаючыя патрэбы бібліятэк у спецыялістах з вышэйшай прафесійнай адукацыяй, высокая бягучасць кадраў, нізкія магчымасці бібліятэк у замацаванні маладых таленавітых спецыялістаў, малая колькасць студэнтаў на факультэце не дазваляюць універсітэту пакуль што задаволіць патрэбы бібліятэк у выпускніках данага профілю.

Зараз на ФБІС БУК па спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія" на ўсіх 10 спецыялізацыях навучаецца 439 студэнтаў. Невялікая колькасць студэнтаў на старэйшых курсах звязана з неабгрунтавана абмежаваным наборам абітурыентаў на ФБІС у сярэдзіне 1990-х гг., калі на першы курс набіралі толькі па 35—40 студэнтаў. Крыху выправіць сітуацыю ўдалося за кошт набору студэнтаў у спецгрупы, якія фарміруюцца на базе выпускнікоў МБТ і МВЛГК і пачынаюць навучанне адразу з 3-га курса.

Агульнымі намаганнямі універсітэта і бібліятэчнай грамадскасці набор на факультэт у апошнія гады ўдалося павялічыць. Напрыклад, у 1998 і 1999 гг. планавы набор на 5-гадовы тэрмін навучання складаў ужо 65 студэнтаў; 30 і 25 студэнтаў (адпаведна гадам) прыняты на 3-х гадовы тэрмін навучання. Акрамя таго, у 1999 г. 39 студэнтаў былі залічаны на факультэт на ўмовах кампенсацыйнай аплаты. Такім чынам, агульная колькасць набору на спецыяльнасць "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія" у гэтым годзе склала 129 студэнтаў.

Аналіз вынікаў уступных экзаменаў пацвярджае дастаткова высокі ўзровень папулярнасці нашай прафесіі сярод моладзі. Напрыклад, на планавыя 65 месцаў у 1999 г. прэтэндавала 186 абітурыентаў, агульны конкурс, такім чынам, склаў 2,9 на месца. Найбольшай папулярнасцю сярод абітурыентаў і іх бацькоў карыстаюцца наступныя спецыялізацыі: "Бібліятэказнаўства, бібліяграфія і замежная мова", "Аўтаматызаваныя бібліятэчныя і інфармацыйныя сістэмы" і інш. Конкурс на іх складае больш за 3 прэтэндэнты на месца. Разам з тым мала прываблівымі для абітурыентаў з`яўляюцца такія спецыялізацыі, як "Публічныя бібліятэкі", "Дзіцячыя і школьныя бібліятэкі", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія, краязнаўства".

Аналіз вынікаў размеркавання выпускнікоў ФБІС ў 1998 і 1999 гг. паказвае, што бібліятэкі адчуваюць вострую неабходнасць у маладых спецыялістах з вышэйшай адукацыяй. Колькасць заявак у 2—3 разы перавышае колькасць выпускнікоў, а па асобных спецыялізацыях — у 8 разоў. У 1999 г. на аднаго выпускніка была пададзена ў сярэднім 2,4 заяўкі, а без уліку платнікаў, якія маюць права на самастойнае працаўладкаванне, — 2,7.

Дабіцца паўнацэннага камплектавання бібліятэчных калектываў спецыялістамі з вышэйшай кваліфікацыяй магчыма ў выніку рэалізацыі шэрага комплексных мер, асноўнымі сярод якіх з'яўляюцца павелічэнне набору на ФБІС БУК, узмацненне БУК і бібліятэкамі прафарыентацыйнай работы сярод моладзі, стварэнне умоў для замацавання ў бібліятэках маладых спецыялістаў, павышэнне грамадскага статуса бібліятэкі і бібліятэкара.